Источник: "Звязда" - 2018-05-12

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 90

навукова-тэхнічных і інавацыйных распрацовак будзе прадстаўлена на XXV Міжнародным форуме па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях «ТІБО-2018», які пройдзе ў Мінску 14—18 мая. Распрацоўкі будуць прэзентаваны на калектыўным стэндзе ДКНТ. Са сваімі дасягненнямі і праектамі азнаёмяць установы і арганізацыі Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук і Беларускага інавацыйнага фонду. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі прадставіць 15 экспанатаў, у прыватнасці шматузроўневую сістэму дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, Беларускі інавацыйны фонд прэзентуе праекты пераможцаў і фіналістаў рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў у сферы інфармацыйных тэхналогій і прыборабудавання. Сярод іх будзе кішэнны робат PocketBot — інтэлектуальны аўтаномны мабільны робат, бартавы камп'ютар для ўсталявання на сельскагаспадарчую тэхніку і інш.